
Маланка 1926

Паасобныя №№

ГОД ВЫДАНЬНЯ ПЕРШЫ · АСОБНЫ НУМАР **40** ГРОШ.



Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:	№ 7	ПАДПІСНАЯ ЦАНА:
ВІЛЬНЯ, Віленская вул., № 12, кв. 6	**15 САКАВІКА**	на 1 год 8 злот. „ паўгоду 4 „ „ тры мес. 2 „ „ адзін м. 1 „
«МАЛАНКА»	**1926 г.**	*За граніцу*: на год—тры даляры, на паўгоду—1 д. і 50 цэнт.



Сучасная Фэміда: Якая дзіўная роўнавага!



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЧАСТУШКІ.

Беларусь.

Як сьвет сьветам ад вякоў
Ўсё судзілі мужыкоў,
А нарэшце раззлаваліся —
Да ксяндзоў ужо дабраліся,
Бо як можа ён „psia mać".
Беларусам сябе зваць!..
Як пазнае ўжо вастрогу
Тагды можа болей к Богу
З „хамскай мовай" не наважыцца,
А ўжо розум яго разьвяжацца:
І пазнае, што да неба
З „панскай мовай" лезьці трэба!

Польшча.

Пэпээсы і эндэкі
І „пястоўцы" і „хадэкі"
Благім матам ўсе крычаць:
— Лігу! Лігу! Лігу — даць!
Як ня будзе месца ў Лізе
Дадзём *Заходу* па фізе,
Вазьмём з Францыяй развод, —
А зьвярнёмся на *Усход!*

Безработны крычыць: — хлеба!
Манархісты: — „круля тшэба"!
Сойм Вітосу надаеў,
Ён другога захацеў.

Францыя.

Ой, дык тыры — тыры — тыры!
Францыя Польшч на буксіры
Хацела ў Лігу пацягнуць,
Свае фокусы загнуць.
Аж ужо Брыян у страху
Праваліўся ён з размаху,
Сядзіць плача ён на печы
Дастаў мешалкай па нечым!

Нямеччына.

Ў немцаў сьвята урачыста:
Ім кланяюцца ўсе чыста
Аб падлогу б'юць ўсе лбом,
Садзяць ў Лізе за сталом.
Ужо нова эра пачынаецца:
„Трактат Вэрсальскі" распаўзаецца,
Зьнікнуць з ім ўсе пабедзіцелі —
Эўропэйскія чмуціцелі

Італія.

Мусоліні ашалеў —
Крычыць грозна, нібы леў:
„Я зраблю, што захачу
„Усім голавы скручу!"
А сам баіцца, сам трасецца—
Гневу, помсты спадзяецца,
Што заткнець яму ўжо рот
Падняволены народ.

Гішпанія.

Дыктатар Прымо-дэ-Рывэра
Адчыніць у Лігу дзьверы,
Так, як Скшынскі захацеў,
Але дарэмна ён пацеў,
Бо сказалі: „ідзі прэч,
К чорту мацеры пад печ!
Нам самім тут мала месца,
А яшчэ і ён тут прэцца!"

Мароко.

А рыфэны і кабілы
Даюць чосу, што аж міла, —
Досыць ўжо цярпець ім зьдзекі,
Вызваляюцца з апекі.
А „культурнікі" з Заходу
Уцякаюць драла — ходу,
Забіраюць і манаткі,
Аж блішчаць „культурны" пяткі.

Янка М.







Крапіва.

Будуйце лазьні.

Беларус па вушы гразьне,
Але ў вёсках Беларусі
Днём з агнём ніводнай лазьні
Не знашоў-бы нават мусі.

Ад Барысава да Слуцку
(Аж прызнацца нек нялоўка)
Ўсе прывыклі не палюдзку
Сяк-так боўтацца ў начоўках.

Сяк-так дзядзька плечы й грудзі
Папалам памые з горам,
Але далей кажа — „будзе“ —
Разьдзявацца, бачыш, сорам.

Так, як кветкі, маладзіцы
Тут страчаюцца парою,
Але ніжай паясьніцы
Абрасьлі, як ёсьць, карою.

Нават людзі ёсьць такія,
Што другую палавіну
Ім хто-небудь толькі мые,
Як кладзе у дамавіну.

Лазьняў болей — больш здароўя,
Гразь-жа нам нясе хваробу,
Дык збудуйце-ж — клічу зноў я —
Хоць адну на тую спробу.

Добры сынок.

Сынка ў школу выпраўляе,
Маці, плача й навучае:
—Глядзі-ж, Андрэйка мой, вучыся
І ня дурэй і не ляніся.
Каб, як станеш сам на ногі,
Бацьком даў тады падмогі!

Сынок стаяў сам маўклiва,
Відаць думаў ён тужліва,
Было жаль кідаці хатку,
Бацьку роднага і матку.

Нарэшце з духам нек сабраўся
І гэтак к матцы адазваўся:
— Мне, мамка, проста сэрца
рвецца
Глядзеце — цяжка вам жывецца;

Нячым у школе боты драці, —
Я за зіму-б вам хлеба ў хаце
(Калі-б здароўе даў мне Бог)
Вун колькі зьесьці дапамог!

А так, што зробіце вы самі,
З такімі дрэннымі зубамі.
Чужы ніхто вам не паможа...
А што — няпраўду кажу можа?

Я. Башкір.



Палітыка.

— Якая ёсьць розьніца паміж быўшым міністрам скарбу Ўл. Грабскім і цяперашнім Зьдзехоўскім?

— Тая, што Ўл. Грабскі ўкінуў Польшчу ў прорву бяды, а Зьдзехоўскі ніяк стуль выцягнуць ня можа. Імп...



Дух часу.

Аднаго селяніна, Янку, ўгаварылі, каб злажыў свае ашчаднасьці (грошы) ў банк. За тыдзень прыходзе да банку і жадае пры вaконцы сваіх грошаў. Скарбнік намаўляе яго, каб пакінуў хоць некульні грошай, каб ня выгасла конто.

— Не, — адказвае селянін, — жадаю ўсіх сваіх грошаў!

Скарбнік дае яму яго 100 залатых. Селянін пералічыў дакладна і аддае грошы назад.

— Усе ў парадку, — кажа Янка. Я адно хацеў бачыць, ці ня ўкралі. «Зиз».



— Вось дзіўна, чаму гэта рэдукуюць толькі ніжэйшых ураdоўцаў, а вышэйшыя застаюцца на сваім месцы?

— А ў нас у Вільні звальняюць і вышэйшых.

— ?

— Чытаў-жа, мусіць, у газэтах: арыштавалі падпракуратара Гурчына; засудзілі камісара Шольца і...



Добра адказаў.

Беларус заходзе ў польскую кнігарню і просіць „Беларускі лемантар“.

— Мы гэтакім таварам не гандлюем, — адказвае кнігар.

— А чым?

— Дурнямі...

— Эге, мусіць добра торг ідзе, калі толькі адзін дурань застаўся, — адказаў селянін, паказваючы пальцам на кнігара.

С-н-свой.



У ДОКТАРА.

— Вы вельмі кепска выглядаеце. Вам канешне трэба спачынак.

— Гэта немагчыма!

— Чаму! Вы шмат працуеце?

— Не! Калі за сном і адпачыць няма калі.

НА КІРМАШЫ.

Баба ў падзёртай вопратцы:

— Колькі каштуюць гэтыя гусі?

— Нашто пытаешся? Усё роўна ня купіш!

— Няўжо-ж беднаму чалавеку і запытацца ня можна! Нават гэтай прыемнасьці перад сьвятам не даюць!..



ДЭЗЭРТЫР.

У вагоне едзе ахвіцэр, а насупраць яго сядзіць пасажыр, па каўняры каторага поўзае блашчыца.

— Пане! во дэзэртыр ходзе, — паказвае ахвіцэр на блашчыцу.

— Што, дэзэртыр? — Дык марш да войска!.. — адказаў пасажыр, скінуўшы блашчыцу на ахвіцэра.



НА НАВУЦЫ СТАРАСЛАВЯНСКАЙ МОВЫ.

Настаўнік: Калі мы выкінем са слова „старана“ першае „а“, тады будзе старaславянскае „страна“. Падобна дзееца і са словам „варона“ і гэт. далей.

Вучань: А як будзе, пане настаўнік, са словам „сарока“?

Настаўнік: Сядзі, дурань!

«Зиз».



ЯШЧЭ НЯ СЬНЕДАЎ.

— Ці ты ўжо сьнедаў?

— Не, яшчэ ня сьнедаў.

— Чаму?

— Ды вось хадзіў да дому, а сьнедаць ня было чаго, дык я зьеў краюх хлеба ды два кавалкі сала, — вось яно і ўсё. Гэтак і хаджу, ня сьнедаўшы!



ДОБРАЯ РАДА.

Пане доктар! Я бедная ўдава з пяцярма дзяцьмі: ня маю срэдстваў на пражыцьцё, а да гэтага яшчэ хворая: усё баліць мне ў сярэдзіне, кашляю. Што маю рабіць?

— Калі вы бедная і ня маеце за што лячыцца, дык вам трэба канешне ехаць у Крым, або ў Італію, бо толькі паўднёвы клімат вам паможа.





Міністар асьветы Станіслаў Грабскі:

У імя ашчаднасьці трэба зьменшыць лік школаў амаль на палову, а беларускіх школаў сусім не адчыняць, бо на што мужыку тая навука, калі яго справа, капацца ў зямлі і гнаі...



Манархіст:

(З прычыны утварэньня манархістычнай партыі у Сойме).

— Божа! Калі ты не пашлеш нам „бацькі-збавіцеля", дык пашлі ляпей мне сьмерць, бо не магу я глядзець, як нацыянальныя меншасьці жывуць, растуць і набіраюцца сілаў, а працоўны люд дамагаецца сваіх правоў!

Прыдзе пара.

Сьпімо, браткі, пара прачхнуцца.
Сьмяюцца з нас — зусюль сьмяюцца,
А мы што? — Цярпімо...

Прывык маўчаць, жыве, цярпіць...
Дакуль-жа будзеш сьлёзы ліць.
Дакуль, скажы, мужык!

— Слухай, як шэпчуць хвоі ў лесе;
Ўставай, бядак, мо' ўжо прачхнешся, —
Гамоніць цёмны гай.

Гудзе, скавыча віхар буйны,
Чутно скрозь грокат неспакойны
Словы: „Пара прыдзе!"

Хоць раз тады я засьпяваю,
Зруйную ўсё, з зямлёй зьмяшаю;
— Прыдзе той жданы час!

Зжану бяз сонца сьнег іскрысты,
Справаджу гром той пяруністы
Сустрэну сам вясну.

Магутнай сілай цемру хмараў,
Вагнём маланачных пажараў
Зруйную, разжану!

Той дуб што дзікаю прыродай
Пастаўлен вечнай мне прашкодай
Сталетні дуб зламлю!

А там, дзе вырас ён, дзе быў,
Дзе столькі кусьцікаў глушыў —
Дажджом змачу зямлю.

Яны-ж хай высяцца растуць,
Хай яркім вогнівам цьвітуць,
Прачхнуўшыся ад сну,

Хай кожны скажа ў прывітаньне:
— Я ждаў цябе й сустрэў пяяньнем
Прыгожую вясну!

Міхась Васілёк.



Рэдактар-выдавец **Янка Касяк.**
Друкарня Б. Клецкіна, Вільня